# ДРУГІ ДОМ СТУДЭНТАЎ

Пасля заканчэння школы большасць выпускнікоў абірае для сябе далейшы шлях – паступленне ў каледж, універсітэт ці іншую навучальную ўстанову. Таму, хто вырашыў атрымліваць прафесійныя веды ў сваім горадзе, хвалявацца пра месца пражывання не прыходзіцца. А вось для іншагародніх студэнтаў і іх бацькоў гэта вельмі вострая праблема. Але пры паступленні ў наш універсітэт яна лёгка вырашаецца: кожны першакурснік атрымлівае месца ў інтэрнаце.

Студэнцкі інтэрнат – своеасаблівы свет, у якім пануюць пэўныя правілы і законы. Тут з першых дзён адчуваеш, што ты ўжо не пад «бацькоўскім крылом»: трэба гатаваць ежу, прыбіраць пакой, клапаціцца пра чыстае адзенне і, канешне ж, наладжваць адносіны з суседзямі.

Нехта можа сказаць, што ў інтэрнаце можна рабіць усё, што забаранялася дома бацькамі: слухаць гучна музыку, прыходзіць дадому далёка за апоўнач. Але той, хто так думае, памыляецца. У першую чаргу, жыццё ў інтэрнаце вучыць адказваць за свае ўчынкі, быць самастойнымі, дапамагаць іншым.

Можа скласціся таксама ўражанне, што ў інтэрнаце акрамя таго, як есці, спаць ды рыхтавацца да заняткаў, рабіць больш няма чаго. Але гэта не так. Па колькасці мерапрыемстваў інтэрнат не саступае ўніверсітэту: тут кожны знойдзе сабе занятак па душы. На працягу ўсяго навучальнага года ладзяцца міжінтэрнацкія спартыўныя спаборніцтвы, турніры па тэнісе, дартсе. Для тых, хто хоча даведацца пра гісторыю Віцебска, арганізоўваюцца сумесныя паходы ў бібліятэкі, музеі. Акунуцца ў свет мастацтва дапаможа наведванне тэатраў, кінатэатраў, мастацкіх галерэяў. Сустрэчы з запрошанымі дактарамі і псіхолагамі дапамогуць папоўніць свой запас ведаў. А пра святочныя дні нагадаюць шматлікія акцыі і тэматычныя насценгазеты.

З вялікім задавальненнем хлопцы і дзяўчаты ўдзельнічаюць у разнастайных канцэртах і конкурсах: «Калейдаскоп талентаў», «Батл гітарыстаў», «Містар інтэрната ВДУ», «Міс інтэрната ВДУ», «Суперстудэнт». І гэта далёка не ўсе мерапрыемствы, у якіх кожны ахвотны можа прадэманстраваць свае таленты.

Менавіта тут, у студэнцкім асяродку, сустракаюць каханне, знаходзяць самых надзейных і адданых сяброў. Інтэрнат – месца, дзе заўсёды прыйдуць на дапамогу, падтрымаюць і ў бядзе, і ў радасці.

**Ірына МІКУЦКАЯ,**
**студэнтка 3 курса ФлФ.**